часта надуманых і сфабрыкаваных абвінавачванняў сталі дзеячы навукі і культуры, кіраўнікі дзяржаўных і партыйных органаў у рэспубліках.

У БССР была сфабрыкавана справа аб «Саюзе вызвалення Беларусі». У 1931 г. за прыналежнасць да гэтай арганізацыі было асуджана 86 чалавек.

За перыяд з 1920-х па 1950-я гг. у Беларусі было рэпрэсавана 235,5 тыс. чалавек. У ходзе рэабілітацыі, што пачалася пасля смерці І. В. Сталіна, было апраўдана больш за 170 тыс. грамадзян, якія пацярпелі ад палітычных рэпрэсій.

1. Калі быў створаны СССР? Якія былі прычыны яго стварэння?
2. Як вы лічыце, якое гістарычнае значэнне мела ўваходжанне БССР у склад СССР? Свой адказ абгрунтуйце.
3. Сфармулюйце 3 тэзісы, уключыўшы ў іх найбольш важныя, на ваш погляд, характарыстыкі грамадска-палітычнай сістэмы БССР у 1920—1930-я гг.
4. У якасці аднаго з фактараў перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг. у навуковай гістарычнай літаратуры называецца савецкая грамадска-палітычная сістэма, якая сфарміравалася да канца 1930-х гг. Ці згодныя вы з такім меркаваннем? Якія элементы савецкай грамадска-палітычнай сістэмы, па вашым меркаванні, садзейнічалі перамозе ў вайне? Сваё меркаванне аргументуйце.
5. Прааналізуйце які-небудзь твор мастацтва, што адлюстроўвае жыццё ў БССР у 1920—1930-я гг. Якія элементы грамадска-палітычнага жыцця таго часу паказаныя ў ім?

## § 5. Грамадска-палітычнае жыццё ў другой палове 1940-х — 1980-я гг.

§ 5-1

§ 5-2

§ 5-3

§ 5-4

Якімі былі асноўныя рысы савецкай грамадска-палітычнай сістэмы, што склаліся ў 1930-я гг.?

**Асаблівасці пасляваеннага ўнутрыпалітычнага жыцця ў БССР.** У пасляваенныя гады ў СССР захоўвалася адзіная дзяржаўная ідэалогія, аднапартыйная палітычная сістэма. Рашэнні, якія прымаліся кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, з’яўляліся абавязковымі не толькі для яе членаў, але і для ўсіх дзяржаўных органаў і грамадскіх арганізацый. У руках ВКП(б) знаходзіліся ўсе рычагі дзяржаўнага і гаспадарчага кіравання.

Большасць савецкіх людзей шчыра верылі Камуністычнай партыі і І. В. Сталіну. Саветы падпарадкоўваліся партыйным органам і не прымалі рашэнні самастойна.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Дзейнасць партыйна-дзяржаўнай улады ў БССР у дадзены перыяд кантралявалася саюзным кіраўніцтвам. Яно ажыццяўляла і назначэнні на галоўныя кіруючыя пасады ў рэспубліцы. Пры гэтым перавага аддавалася кадрам з іншых саюзных рэспублік. Першымі сакратарамі ЦК КПБ у гэты перыяд з'яўляліся: П. Панамарэнка (1938–1947 гг.); М. Гусараў (1947–1950 гг.); М. Патолічаў (1950–1956 гг.).

Ленінскі камуністычны саюз моладзі Беларусі (ЛКСМБ) з'яўляўся масавай арганізацыяй, што аб'яднала большасць юнакоў і дзяўчат ва ўзросце ад 14 да 28 гадоў, якія працавалі альбо вучыліся. Камсамол быў кузняй кадраў для партыі. Так, сакратары ЛКСМБ К. Мазураў, П. Машэраў, А. Аксёнаў сталі дзяржаўнымі і палітычнымі дзеячамі. Энтузіязм і натхненне былі адрознай рысай грамадскага жыцця ў БССР у пасляваенны перыяд. Савецкі народ, які атрымаў перамогу над фашысцкай Германіяй, гераічна працаваў, адраджаючы народную гаспадарку.

Палітычная сітуацыя ў заходніх абласцях Беларусі ўскладнялася тым, што ажно да сярэдзіны 1950-х гг. там дзейнічалі польскія нацыяналістычныя фарміраванні, якія наганялі жах на мясцовае насельніцтва.

На адзін узровень з гітлераўскімі карнікамі паставілі сябе былыя салдаты Арміі Краёвай пад камандаваннем Рамуальда Райса («Бурага»). Дакументальна пацверджаны выпадкі правядзення карных рэйдаў па знішчэнні цэлых вёсак, забойства мясцовых жыхароў, а таксама партыйных і камсамольскіх актывістаў, урачоў, настаўнікаў, вайскоўцаў.

**Перамены ў грамадска-палітычным жыцці ў другой палове 50-х — першай палове 60-х гг. ХХ ст.** У грамадска-палітычным жыцці БССР, як і ў цэлым у СССР, у другой палове 1950-х — першай палове 1960-х гг. назіраўся працэс паступовага змякчэння палітычнага рэжыму. Пачатак дадзенага працэсу супадае па часе са смерцю І. В. Сталіна ў 1953 г. У выніку ўнутрыпартыйнай барацьбы перамогу атрымаў М. С. Хрушчоў. Гэты перыяд праўлення з 1953 па 1964 г. атрымаў у публіцыстыцы назву «адліга».

Ключавой падзеяй дадзенага перыяду стала правядзенне ХХ з'езда КПСС у лютым 1956 г., дзе была прынята пастанова, якая ўтрымлівала вострую крытыку культу асобы І. В. Сталіна. Разам з тым асновы існуючага ў СССР грамадскага ладу прызнаваліся адпаведнымі «прынцыпу сацыялізму».

У час «адлігі» была праведзена ўсеагульная амністыя палітычных зняволеных і частковая рэабілітацыя ахвяр палітычных рэпрэсій. Толькі ў БССР было рэабілітавана каля 40 тыс. чалавек.

Пашырыліся правы саюзных рэспублік: з 1957 г. уводзілася самастойнасць рэспубліканскіх органаў улады ў сферы прыняцця нарматыўных прававых актаў; у падпарадкаванне рэспубліканскіх ведамстваў пераходзілі многія прадпрыемствы і арганізацыі, якія раней падпарадкоўваліся саюзным уладам; саюзныя рэспублікі атрымалі права самастойна вырашаць адміністрацыйна-тэрытарыяльныя пытанні.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Кірыл Трафімавіч Мазураў

*Ці закраналі змены, якія адбыліся ў грамадска-палітычным жыцці СССР пры М. Хрушчове, асноўныя прынцыпы кіравання дзяржавай, што сфарміраваліся яшчэ ў сталінскія часы? Складзіце і пракаменціруйце схему «Кірункі „адлігі“».*

Адбыліся змены ў адміністрацыйным дзяленні рэспублікі. У БССР замест 11 абласцей засталося 6, замест 123 сельскіх раёнаў — 77.

Былі пашыраны правы Саветаў усіх узроўняў, якія маглі накіроўваць сродкі на жыллёвае будаўніцтва, камунальную гаспадарку, сферу паслуг і добраўпарадкаванне населеных пунктаў. Новыя магчымасці былі прадастаўлены прафсаюзам і камсамолу. Прафсаюзныя арганізацыі ўдзельнічалі ў размеркаванні жылля, санаторна-курортных пуцёвак, правядзенні сацыялістычнага спаборніцтва. У 1956 г. першым сакратаром ЦК КПБ стаў беларус К. Мазураў (1956–1965).

Палітыка М. Хрушчова, накіраваная на рэалізацыю жаданых мэт без уліку аб'ектыўных законаў развіцця грамадства, рэальных абставін і магчымых наступстваў, характарызавалася як «палітыка валюнтарызму». Яе праявай стала прыняцце на XXII з'ездзе КПСС новай праграмы пабудовы камуністычнага грамадства да 1980 г. У гады праўлення СССР М. Хрушчовым адбылося яшчэ большае ўмацаванне партыйнага кантролю і кіравання ўсімі сферамі жыцця краіны.

**Канстытуцыйнае замацаванне кіруючай ролі Камуністычнай партыі. Канцэпцыя «развітога сацыялізму».** З прыходам да ўлады Л. Брэжнева (1964 г.) і абраннем яго першым сакратаром ЦК КПСС адбывалася далейшае ўмацаванне партыйнага кіравання дзяржавай.

У Канстытуцыю СССР 1977 г. быў уключаны артыкул 6, у якім гаварылася, што «накіроўваючай і кіруючай сілай савецкага грамадства, ядром яго палітычнай сістэмы з'яўляецца Камуністычная партыя Савецкага Саюза». Гэтае палажэнне Асноўнага Закона СССР было прадубліравана ў новай Канстытуцыі БССР 1978 г.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Выкажыце меркаванне, у сувязі з чым савецкім кіраўніцтвам была выстаўлена і актыўна прапагандавалася канцэпцыя «развітога сацыялізму».*

Важнейшым кірункам палітычнага курсу савецкага кіраўніцтва ў другой палове 1960-х — першай палове 1980-х гг. стала канцэпцыя «развітога сацыялізму». Было заяўлена, што «ў СССР пабудавана развітое сацыялістычнае грамадства» і створана неабходная для гэтага матэрыяльна-тэхнічная база. У СМІ разгарнулася актыўная прапаганда дасягненняў савецкага ладу: звярталася ўвага на тое, што сацыяльна-эканамічнае становішча грамадзян СССР паляпшаецца, магчымасці для задавальнення ўсіх патрэб павялічваюцца.

З 1965 па 1980 г. Камуністычную партыю Беларусі ўзначальваў П. М. Машэраў. З яго імем звязаны многія дасягненні ў развіцці эканомікі, навукі і культуры рэспублікі.

З 1983 па 1987 г. партыйную арганізацыю БССР узначальваў М. М. Слюнькоў. За гэтыя гады рэспубліка дабілася поспехаў у развіцці сельскай гаспадаркі: на 30 % павялічылася вытворчасць валавой прадукцыі, у 1,5 раза вырасла зарплата на сяле. Зніклі чэргі ў магазінах. Па выніках Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва ў 1983—1987 гг. БССР была прызнана безумоўным пераможцам.

Аднак у цэлым у СССР адчувалася пагаршэнне грамадска-палітычнай сітуацыі. Па меры ўзмацнення ўлады партыйнага апарату наспявала незадаволенасць. Частка інтэлігенцыі стала крытыкаваць савецкую сістэму. У адказ была ўзмоцнена цэнзура, не дапускаліся крытычныя ацэнкі рэальнага становішча «ў грамадстве развітога сацыялізму». У Крымінальны кодэкс БССР быў уключаны артыкул, які прадугледжваў пазбаўленне волі за антысавецкую прапаганду.




Канстытуцыя БССР 1978 г.



Пётр Міронавіч Машэраў

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Палітыка перабудовы ў БССР.** У сярэдзіне 1980-х гг. у СССР і БССР пачалася перабудова — перыяд радыкальных пераўтварэнняў, якія ў выніку прывялі да ліквідацыі ўлады КПСС і распаду СССР. Дадзены перыяд звязаны з прыходам да ўлады генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачова.

На пачатковым этапе М. С. Гарбачоў лічыў галоўнай задачай удасканаленне сацыялізму, таму былі выкарыстаны традыцыйныя падыходы да мадэрнізацыі эканомікі: захоўваліся стары гаспадарчы механізм і адміністрацыйна-камандная сістэма. Рэфармаванне было зведзена да ўзмацнення кантролю за якасцю выпушчанай прадукцыі і паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця. Рабіліся першыя крокі ў кірунку рыначных адносін. Але ў хуткім часе няўдачы ў эканамічнай сферы падштурхнулі палітычнае кіраўніцтва СССР да рэфармавання палітычнага ладу краіны. У красавіку 1985 г. быў узяты курс на дэмакратызацыю палітычнага жыцця. Была абвешчана рэформа сістэмы палітычнай улады. У канцы 1988 г. былі ўнесены папраўкі ў Канстытуцыю СССР. Вышэйшым органам заканадаўчай улады станавіўся З'езд народных дэпутатаў СССР, які фарміраваў Вярхоўны Савет СССР. Быў прыняты новы выбарчы закон, паводле якога прадугледжваліся свабодныя выбары ва ўсе органы прадстаўнічай улады на альтэрнатыўнай аснове; разам з тым 1/3 месцаў у дадзеных органах пакідалася для прадстаўнікоў дзяржаўных грамадскіх арганізацый. У сакавіку 1989 г. адбыліся выбары З'езда народных дэпутатаў СССР, 60 дэпутатаў былі абраныя ад БССР.

> ? *Абмяркуйце, у якіх зменах мела патрэбу савецкая грамадска-палітычная сістэма БССР у сярэдзіне 1980-х гг.*

Партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва БССР на чале з першым сакратаром ЦК КПБ Я. Сакаловым (1987—1990 гг.) займала больш кансерватыўныя пазіцыі ў параўнанні з саюзным кіраўніцтвам і крытычна ставілася да хуткіх палітычных пераўтварэнняў. Разам з тым у БССР, як і ў цэлым у СССР, палітыка галоснасці прывяла да імклівага фарміравання грамадзянскай супольнасці: узнікалі грамадзянскія ініцыятывы, ствараліся дыскусійныя і рабочыя клубы, грамадскія арганізацыі.

У сакавіку — красавіку 1990 г. прайшлі першыя ў гісторыі БССР выбары ў Вярхоўны Савет на альтэрнатыўнай аснове. Вярхоўны Савет БССР пачаў сваю працу ў чэрвені 1990 г. у складзе 360 дэпутатаў. Большасць дэпутатаў складалі прыхільнікі кіруючага партыйна-дзяржаўнага апарату. Адначасова пры падтрымцы парламенцкай большасці быў сфарміраваны Савет Міністраў на чале з В. Ф. Кебічам.

**Фарміраванне шматпартыйнасці.** III пазачарговы З'езд народных дэпутатаў СССР (сакавік 1990 г.) адмяніў 6-ы артыкул Канстытуцыі СССР, ліквіда-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ваўшы такім чынам манаполію КПСС на ўладу ў краіне. У ліпені 1990 г. адпаведныя змены былі ўнесены і ў Канстытуцыю БССР. У гэты ж час Вярхоўны Савет БССР прыняў пастанову «Аб рэгістрацыі грамадскіх аб'яднанняў у Беларускай ССР». У рэспубліцы з'явілася прававая аснова для фарміравання шматпартыйнай сістэмы.

У пачатку 1990-х гг. у Беларусі масава ствараліся палітычныя партыі. Першыя палітычныя партыі былі нешматлікімі і ў асноўным абапіраліся на інтэлігенцыю.

1. У чым праявілася «адліга» ў грамадска-палітычным жыцці БССР у другой палове 1950-х — першай палове 1960-х гг.?
2. Сфармулюйце 3 тэзісы, уключыўшы ў іх найбольш важныя, на ваш погляд, характарыстыкі грамадска-палітычнай сістэмы БССР у другой палове 1960-х — першай палове 1980-х гг.
3. У чым заключалася дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця ў БССР у другой палове 1980-х — пачатку 1990-х гг.?
4. Складзіце слоўнік гістарычных тэрмінаў, якія характарызуюць грамадска-палітычнае развіццё БССР у другой палове 1940-х — 1980-х гг. (не менш за 7 тэрмінаў). Дайце іх вызначэнні.
5. Прааналізуйце які-небудзь твор мастацтва, што адлюстроўвае жыццё ў БССР у другой палове 1940-х — 1980-я гг. Якія элементы грамадска-палітычнага жыцця таго часу паказаны ў ім?

# § 6. Станаўленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь

§ 6-1

§ 6-2

Калі і з якой мэтай быў створаны СССР?

**Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР ад 27 ліпеня 1990 г. і наданне ёй статусу канстытуцыйнага закону.** Рэфармаванне савецкай сістэмы ў гады перабудовы прывяло да глыбокага сістэмнага крызісу. Падзенне прадукцыйнасці працы, спыненне прадпрыемстваў, рост цэн, рэзкае зніжэнне ўзроўню жыцця насельніцтва, татальны дэфіцыт, разрыў эканамічных сувязей паміж рэгіёнамі абвастрылі супярэчнасці паміж рэспублікамі, прывялі да страты аўтарытэту СССР. Аднак кіраўніцтва СССР марудзіла з прыняццем адэкватных рашэнняў па рэфармаванні савецкай федэрацыі.

У 1990 г. пачаўся працэс абвяшчэння незалежных рэспублік («парад суверэнітэтаў»). 12 чэрвеня 1990 г. быў абвешчаны суверэнітэт Расійскай Федэрацыі, а 16 ліпеня — Украіны.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ